УДК 008(=161.3)(091)

# САЦЫЯКУЛЬТУРНЫЯ ДЭТЭРМІНАНТЫ ФАРМІРАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ЭТАСУ

***К.Ф. ЛЫСАК***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Мінск)***

*Фарміраванне нацыі з'яўляецца складаным працэсам, які працякае пад уздзеяннем сістэмы знешніх і ўнутраных сацыякультурных умоў. Разам са стварэннем узораў высокай нацыянальнай культуры, узнікненнем нацыянальных рухаў, пашырэннем нацыянальнай свядомасці адбываецца станаўленне сістэмы маральна-этычных нормаў, каштоўнасцяў, стылю паводзін, якія ўласцівы прадстаўнікам пэўнай нацыянальнай супольнасці, – нацыянальнага этасу.*

*Нацыятворчыя працэсы на беларускіх землях у XIX ст. адбываліся ў кантэксце ўзнікнення сучасных нацый ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне. Спецыфіка фарміравання беларускай нацыі была звязана як з палітычнымі ўмовамі, так і з адметнасцямі беларускай культуры. Выяўленне і характарыстыка сацыякультурных дэтэрмінантаў нацыянальнага этасу на ранніх этапах фарміравання беларускай нацыі накіраваны на раскрыццё каштоўнаснай сістэмы і асноўных маральных нормаў, уласцівых беларусам.*

***Ключавыя словы**: нацыянальны этас, сацыякультурныя дэтэрмінанты, нацыятворчыя працэссы.*

**Уводзіны.** Нацыянальны этас як катэгорыя культуры з'яўляецца сістэмай ідэалаў, маральных імператываў, нормаў паводзін прадстаўнікоў нацыянальнай супольнасці, якія ўплываюць на нацыянальны характар, вызначаюць змест нацыянальнай культуры.

Дынаміка нацыянальнага этасу ўзаемаабумоўлена працэсамі фарміравання нацыі. Гэта выяўляецца праз змену яго формы і зместу. Непасрэдны ўплыў на гэты працэс аказваюць як унутраныя, так і знешнія сацыякультурныя ўмовы, таму вызначэнне асноўных сацыякультурных дэтэрмінантаў нацыянальнага этасу і іх сэнсавага напаўнення паспрыяе больш глыбокаму разуменню спецыфікі нацыятворчых працэсаў.

**Асноўная частка.** У сучаснай навуцы катэгорыя "дэтэрмінант" характарызуецца як папярэдняя ў часавых адносінах умова, акалічнасць ці сродак [1, с. 6] у адносінах да бягучага моманту. З'ява дэтэрмінізму актыўна разглядаецца ў гуманітарным пазнанні. А.К. Кужугет, расійская даследчыца сацыякультурных дэтэрмінантаў духоўнай культуры традыцыйнага грамадства, азначае, што ўяўленні пра дэтэрмінізм уваходзяць у структуру навуковага метаду, у якім базавымі паняццямі з'яўляліся аналіз і раскрыццё ўмоў, прычын і заканамернасцей сацыяльных змен. Дэтэрмінізм у сістэмным падыходзе, які займае прыярытэтнае становішча ў гуманітарным пазнанні, азначае цэласнасць разнастайных складнікаў сістэмы грамадства [2, с. 13].

Такім чынам, сацыякультурныя дэтэрмінанты нацыянальнага этасу можна разумець як сістэму фактараў, якія абумоўліваюць выяўленне сукупнасці ўстойлівых каштоўнасцей, ідэалаў, нормаў, маральных імператываў, якія рэгулююць паводзіны прадстаўнікоў нацыянальнай супольнасці.

Узнікненне нацый як суб'екта гісторыі і культуры звязана са з'яўленнем нацыянальных рухаў, якія набралі моц у XIX стагоддзі, што прывяло да сучаснай канфігурацыі карты свету, якая складаецца сёння з нацыянальных дзяржаў. На ўзнікненне і сутнасць нацыянальных рухаў у розныя часы ў той ці іншай ступені ўплывалі знешнія і ўнутраныя палітычныя ўмовы, сацыяльнае і эканамічнае становішча грамадства, стан развіцця культуры. Сукупнасць гэтых чыннікаў вызначала асноўныя прыярытэты нацыянальнага будаўніцтва, рыторыку першых і наступных прадстаўнікоў нацыянальных рухаў, а таксама асаблівасці іх ўзаемаадносін з народнымі масамі. Нацыянальная інтэлігенцыя артыкулявала мэты, сутнасць нацыянальнага руху, даводзіла ідэю ўнікальнасці пэўнай нацыі праз тэксты культуры, фарміруючы такім чынам нацыянальны праект, які прапаноўваўся народу. Такім чынам, можна вылучыць наступныя тыпы сацыякультурных дэтэрмінантаў нацыянальнага этасу: *грамадска-палітычныя, сацыяльна-эканамічныя, асветніцка-адукацыйныя і духоўныя.* Яны не ўяўляюць сабой ізаляваныя адзін ад аднаго фактары, а з'яўляюцца шчыльна звязанай сістэмай, кожны элемент якой уплывае на іншы, падтрымліваючы яго і арганічна дапаўняючы.

Сярод грамадска-палітычных дэтэрмінантаў у першую чаргу вылучаецца *палітычны лад.* Другім, не меней істотным чыннікам, з'яўляюцца *палітычныя і грамадскія рухі.* Таксама сярод грамадска-палітычных дэтэрмінантаў трэба *адзначыць геапалітычныя працэсы.*

Пасля апошняга падзелу Рэчы Паспалітай беларускія землі цалкам апынуліся ў складзе Расійскай імперыі, дзе на той час панавала абсалютная манархія. Дадзенае грамадска-палітычнае пераўтварэнне мала адбілася на сацыяльнай структуры грамадства, а буйныя магнаты на польскіх, літоўскіх і беларускіх

землях проста, у духу традыцый феадалізму, змянілі палітычную лаяльнасць, аб'ектам якой стаў другі манарх. У іншым становішчы апынуліся прадстаўнікі дробнай шляхты, якія з часам усё больш гублялі свае правы і папярэдні сацыяльны статус. Пад уплывам хвалі сусветных палітычных і сацыяльных пераўтварэнняў, падзей Вялікай французскай і Амерыканскай рэвалюцый, новых палітычных, грамадскіх і мастацкіх плыняў мясцовая эліта пачала шукаць новыя падыходы да легітымацыі сваёй улады, крыніцай якой павінен быў стаць народ. Гэта заклала грунт нараджэнню сучасных нацыянальных рухаў.

Спецыфіка дзяржаўнага ладу можа непасрэдна ўплываць на інтэнсіўнасць і якасць нацыянальнага руху. Параўноўваючы палітыку расійскіх улад у дачыненні да нацыянальных меншасцяў (у тым ліку і тых, якія насялялі заходнія губерні), якая была накіравана на культурную ўніфікацыю, з ліберальнай палітыкай Аўстрыйскай імперыі ў сярэдзіне XIX ст., можна заўважыць, што аўстрыйскія ўлады падтрымлівалі ўкраінскі рух на сваёй тэрыторыі, што прывяло да развіцця ўкраінскай асветы, прэсы, культурна-асветніцкіх устаноў і партый [3, с. 117].

У першай палове XIX ст. моцныя пазіцыі на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай меў польскі патрыятычны рух. На думку М. Сакаловай, у дадзены перыяд пытанні, звязаныя з разборам шляхты (які тычыўся дробных землеўладальнікаў), моўнымі і канфесійнымі праблемамі, а таксама вызваленнем сялян, не палітызаваліся. У цэнтры ўвагі палітычнага руху было далучэнне да Польшчы, пытанне свабоды друку і цэнзуры, а таксама рэформа грамадскага права [4, с. 135–136].

У далейшым, акрамя пытання незалежнасці і аднаўлення Рэчы Паспалітай у межах 1772 г., стала актуальнай праблема вызвалення сялянства. У сярэдзіне XIX ст. адзначалася радыкалізацыя настрояў у шляхецка-разначынным асяроддзі Польшчы, Беларусі і Літвы, і пачынаецца пэўны сацыяльна-грамадскі рух "знізу" ў сялянскім асяроддзі ў заходніх губернях імперыі. Сярод сялян вядуць прапаганду некаторыя землеўладальнікі, былыя студэнты, распаўсюджваюцца пракламацыі, ананімныя мастацкія творы [5, с. 84–85].

З гэтага вынікае, што на ранніх этапах крышталізацыі беларускай нацыянальнай ідэі нельга казаць пра выразную артыкуляванасць патрабаванняў палітычнай незалежнасці менавіта беларускіх земляў, а разам з тым і пра афармленасць нацыянальнага этасу беларусаў у чыстым выглядзе. Аднак паднявольны стан грамадскасці на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай, удзел у палітычным руху заклаў у асяроддзі пэўных прадстаўнікоў шляхты, якія ў наступным паўплывалі на развіццё беларускага нацыянальнага руху, такія каштоўнасці як свабода, незалежнасць, самастойнасць, непрыняцце прыгнёту.

Сярод грамадскіх рухаў у першай палове XIX ст. набывае моц ліберальная плынь, асноўнымі ідэямі якой былі канстытуцыйны прадстаўнічы парадак, пашырэнне мясцовага самакіравання, свабода асобы ад дзяржаўнай апекі, адмена саслоўных прывілегій, удзел народа ў правасуддзі, усталяванне прамога падаходнага падатку і палітычная свабода, свабода гандлю і працы, неўмяшанне дзяржавы ў эканамічную дзейнасць уласнікаў. Ідэі лібералізму набылі папулярнасць сярод памешчыкаў, якія імкнуліся да вызвалення сялян, перабудовы сваёй гаспадаркі на капіталістычны лад. Прынцып перабудовы сваёй дзейнасці без парушэння існуючых законаў, без рэвалюцыйнай барацьбы і нелегальнай актыўнасці атрымаў назву "арганічная праца". Ліберальны рух у той час прадстаўлялі Р. Тышкевіч, Э. Мастоўскі, Э. Жэлігоўскі і інш. [6, с. 96–97].

Разам з тым у першай палове XIX ст. не гублялі сваіх пазіцый нацыянальна-рамантычныя ідэі, у кантэксце якіх Расійская імперыя разглядалася як дзяржава-захопнік, асноўная ўвага надавалася пытанню палітычнага ладу, спачуванню прыгнечаным, нянавісці да самавольства. У якасці галоўных сродкаў барацьбы для прадстаўнікоў нацыянальна-рамантычнай плыні выступалі змова і ўзброенае паўстанне [6, с. 96–97].

У другой палове XIX стагоддзя адбыліся якасныя змены ў характарыстыцы грамадскіх рухаў не толькі ў заходніх губернях, але і ўва ўсёй імперыі. Прадстаўнікі дэмакратычных колаў бачылі сябе выразнікамі інтарэсаў народных мас, сялянства, а не толькі прывілеяванага саслоўя. Уздым польскага нацыянальна-вызваленчага руху напярэдадні паўстання 1863 г. яскрава пазначыў падзел паміж старымі і новымі тэндэнцыямі ў грамадскай думцы. "Чырвоныя", якія былі прадстаўлены беззямельнай і малазямельнай шляхтай, рамеснікамі і сялянамі, бачылі неабходнасць у агульнанацыянальным узброеным паўстанні супраць царызму; "белыя" (сярэднія і буйныя землеўладальнікі, буйная буржуазія) бачылі дасягненне сваёй мэты шляхам маніфестацый і перамоў з урадам пры дэмакратычнай падтрымцы заходніх дзяржаў [6, с. 96–97].

З развіццём буйной прамысловасці, фарміраваннем працоўнага класу і пашырэннем ідэй марксізму пачаў развівацца працоўных рух, які напрыканцы стагоддзя стаў утвараць саюзы і партыі. На пачатку 70-х гадоў асноўнай формай барацьбы за паляпшэнне становішча працоўных былі стачкі [6, с. 96–97].

Канец XIX стагоддзя таксама характарызуецца нараджэннем беларускага нацыянальнага руху, адпраўной кропкай якога можна лічыць друк першага нумара часопісу "Гоман". Яго стваральнікамі былі ўдзельнікі арганізацыі "Народная воля" беларускага паходжання. Ужо ў гэты час беларускаарыентаваныя

суполкі, якія стваралiся не толькі на Беларусі, але і ў іншых гарадах Расійскай імперыі, характарызаваліся спалучэннем у сваёй дзейнасці асветніцкага і палітычнага кампаненту: вывучэнне і папулярызацыя беларускай культуры суправаджаліся заклікамі да палітычных і эканамічных змен.

Такім чынам, на прыкладзе развіцця грамадскага руху на беларускіх землях можна прасачыць уплыў станаўлення беларускага нацыянальнага руху на нацыянальны этас. Ліберальныя ідэі паспрыялі зацвярджэнню каштоўнасцей справядлівасці, роўнасці. Рамантычная плынь, з аднаго боку, звяртала ўвагу на праблемы простага народу, даводзіла яго палітычную і культурную вартасць, з другога – падкрэслівала неабходнасць адстойваць свае правы і змагацца за свае ідэалы. Сацыялістычны рух прапагандаваў роўнасць людзей незалежна ад іх паходжання, падкрэсліваў значнасць працы, каштоўнасць таго, што здабыта ўласнымі намаганнямі. Папярэднія тэндэнцыі ў грамадскім жыцці на Беларусі шмат у чым вызначылі змест беларускага нацыянальнага руху, які ад пачатку выявіўся ў форме сцверджання самабытнасці беларускага народа, заклікаў да яго палітычнага і сацыяльнага разняволення, патрабавання аўтаноміі.

Наступнай катэгорыяй сацыякультурных дэтэрмінантаў нацыянальнага этасу з'яўляюцца сацыяльна-эканамічныя. Важную ролю ў фарміраванні нацыянальнага этасу адыгрываюць *этнадэмаграфічныя характарыстыкі і сацыяльная структура насельніцтва.* Моцна звязаны з папярэдняй дэтэрмінантай *эканамічны лад, а таксама* стан *гандлю, прамысловасці і шляхоў зносін.* Многія спецыялісты звязваюць поспехі высокай нацыянальнай культуры з развіццём гарадоў, таму не менш істотнай дэтэрмінантай выступае стан і *развіццё населеных пунктаў.*

На працягу ўсяго XIX стагоддзя пераважная колькасць этнічна беларускага насельніцтва пражывала ў сельскай мясцовасці. Адпаведна перапісу 1897 г. 93,8% беларусаў былі сялянамі, а працэнт прадстаўнікоў прывілеяваных саслоўяў сярод беларусаў быў вельмі нізкі [7, с. 221–222].

Сацыяльная мабільнасць сялян значна пашыраецца толькі ў другой палове XIX ст., пасля рэформы 1861 г. Яна была звязана, у першую чаргу, з развіццём капіталістычных адносін і выяўлялася ў сезоннай міграцыі на заробкі, перасяленні ці міграцыі ў гарады. Пашырэнне мабільнасці спрыяла ўсведамленню сваіх этнакультурных асаблівасцей, трансфармацыі сацыяльнай структуры: "У працэсе працоўнай дзейнасці ажыццяўляўся інтэнсіўны абмен этнакультурнай інфармацыяй, што павышала нацыянальную і сацыяльную свядомасць адыходнікаў і безумоўна спрыяла разбурэнню старой патрыярхальнай асновы на сяле" [7, с. 221].

Такім чынам, пражыванне абсалютнай колькасці беларусаў у сельскай мясцовасці і, як вынік, занятасць у сельскай гаспадарцы, спрыяла захаванню этычных нормаў і стылю паводзін, характэрных для традыцыйнага грамадства. Вартасць чалавека ацэньвалася як па асабістых стасунках з ім, так і па яго ўчынках; важнае месца ў душы беларуса займаў вобраз малой радзімы, роднага краю; асноўнай каштоўнасцю, крыніцай жыццядайных сіл, а таксама паказчыкам статусу ў сваім асяродку была зямля. Павышэнне ўзроўню сацыяльнай мабільнасці не было такім моцным, каб адразу разбурыць традыцыйны ўклад жыцця, таму норма падпрадкоўвання аўтарытэту, старэйшым, каштоўнасць сям'і дагэтуль застаюцца значным кампанентам нацыянальнага этасу беларусаў.

Амаль уся мясцовая шляхта была польскай па сваёй культуры і традыцыях, аднак з ярка выяўленым асэнсаваннем сваёй рэгіянальнай адасобленасці, што было абумоўлена вядзеннем сваіх радаводаў ад знаці Вялікага княства літоўскага ("Gente lituanus natione polonus"). Як паказвае гісторыя нацыянальных рухаў ва Усходняй Еўропе, іх нараджэнне адбывалася менавіта ў асяродку вышэйшых саслоўяў, як часткі грамадства, якая мела доступ да адукацыі, высокай культуры і прагрэсіўных заходнееўрапейскіх ідэй. Колькасць шляхты, яе сацыяльная мабільнасць, магчымасць кааперавацца для выразу агульных інтарэсаў уплывала на іх уключанасць у культуратворчыя працэсы, здольнасць усталёўваць трывалыя і прадуктыўныя сувязі з насельніцтвам.

У першай палове XIX ст. пад уплывам захадаў улад Расійскай імперыі пачынае скарачацца колькасць дробнай шляхты, якая складала значны працэнт насельніцтва. Як адзначае В.С. Макарэвіч, "з канца 20-х гг. XIX ст. улады пайшлі на значную трансфармацыю сацыяльнай структуры грамадства ў "далучаных ад Польшчы губернях" з мэтай больш хуткай уніфікацыі грамадскага ладу ў імперыі, павышэння кантролю за грамадска-палітычным жыццём у не рускіх ускраінах, атрымання большых фіскальных і ваенных выгад. З пачаткам кіравання Мікалая I улады ставіцца пытанне аб правамернасці прыналежнасці дробнай шляхты да дваранства" [8, с. 37]. Так, на пачатак 60-х гг. XIX ст. у Мінскай губерні ў дваранстве было зацверджана толькі 12 574 чал. (23,5 %) [8, с. 38].

Наступствы ўрадавай палітыкі ў дачыненні да прадстаўнікоў шляхты ў далейшым таксама адбіваліся на іх здольнасці змяніць свой сацыяльны стан нават з істотным пашырэннем магчымасцей сацыяльнай мабільнасці ў другой палове XIX ст. [9, с. 50].

Свядомая змена сваёй этнакультурнай арыентацыі з польскай (якая была падмацавана наяўнасцю развітай высокай культуры, неперарваным існаваннем эліт, традыцыямі) на літоўскую, украінскую ці беларускую ў перыяд фарміравання сучасных усходнееўрапейскіх нацый суправаджалася ў прад-

стаўнікоў шляхты моцнымі псіхалагічнымі намаганнямі. Аднак актуалізацыя сябе як эліт "негістарычных нацый" не пазбаўляла іх свайго гонару, жадання быць годнымі прадстаўнікамі моцнага народу. У пэўным сэнсе гэта паўплывала на ўяўленне беларусаў пра вобраз кіраўніка, які павінен валодаць такімі якасцямі, як упэўненасць, самаадданасць, мудрасць, служэнне народу.

Эканоміка на беларускіх землях на працягу ўсяго XIX ст. мела аграрны характар. У першай палове стагоддзя крыніцай папаўнення буйной прамысловасці былі гарадскія рамеснікі, аднак пераважную іх частку складалі яўрэі. "Мяжа яўрэйскай аседласці" перашкаджала развіццю купецкай прамысловасці і выкарыстанню вольнанаёмнай працы ў мястэчках. Развіццё памешчыцкага прадпрымальніцтва ў форме вотчынных мануфактур, а таксама канкурэнцыя з боку прамысловасці іншых рэгіёнаў Расейскай імперыі адмоўна адбіваліся на развіцці прамысловасці ў беларускіх гарадах. Засілле паншчынай сістэмы, вузкасць унутранага рынку, адсутнасць значных купецкіх капіталаў таксама стрымлівалі развіццё капіталізму і прамысловасці, фарміраванне кадраў вольнанаёмных рабочых [10, с. 103–104].

У 30–60-ыя гады XIX ст. на праз беларускія землі былі пракладзены дарогі з цвёрдым пакрыццём, якія звязвалі буйныя гарады імперыі. Праз Беларусь прайшлі 55 км Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі. Тым не менш выкарыстанне шляхоў зносін, як і па-ранейшаму, мела сезонны характар: рачны транспарт – вясной, летам, восенню, гужавы – зімой і летам [10, с. 106–107]. Да канца стагоддзя ў эксплуатацыю было ўведзена ўжо 3000 км чыгуначных дарог [11, с. 73].

Другая палова XIX стагоддзя характарызуецца нараджэннем буржуазіі, уцягваннем памешчыцкіх гаспадарак у тавара-грашовыя адносіны. Аднак эканамічная палітыка Расійскай імперыі ў дачыненні да мясцовых памешчыкаў часам мела дыскрымінацыйны характар з-за нізкага ўзроўню палітычнай лаяльнасць мясцовых эліт да існуючай улады.

Адмена прыгону і новая арганізацыя сельскагаспадарчай дзейнасці спрыялі павышэнню прадукцыйнасці сельскай гаспадаркі. Усё больш вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі ўступалі ў тавара-грашовыя адносіны. Мануфактурная, а потым фабрычна-завадская вытворчасць выцясняла прымітыўныя формы, такія як кустарныя промыслы і рамёствы. Большая частка прамысловых прадпрыемстваў была звязана з перапрацоўкай сельскагаспадарчай прадукцыі і мінеральнай сыравіны. Агульны ўзровень развіцця прамысловасці быў нізкі [12, с. 13–14].

Такім чынам, разгледзеўшы асаблівасці эканамічнага развіцця на беларускіх землях у перыяд станаўлення беларускага нацыянальнага руху, можна вылучыць тэндэнцыю да пашырэння тавара-грашовых адносін, асабліва у другой палове XIX ст, што спрыяла нараджэнню мясцовай буржуазіі. Аднак наогул эканоміка працягвала мець выразны аграрны характар, таму каштоўнасці і мадэлі паводзін, характэрныя для капіталістычных адносін (прадпрымальнасць, здольнасць рызыкаваць, асабістая адказнасць за самастойна прынятыя рашэнні і інш.) не набылі распаўсюджання сярод шырокіх колаў насельніцтва. Абмежаванае развіццё прадпрыемстваў таксама наклала свой адбітак на пашырэнне класу працоўных і адпаведнай сістэмы маральных арыенціраў.

Развіццё шляхоў зносін не толькі непасрэдна ўплывала на характар эканамічнай дзейнасці жыхароў беларускіх земляў, але і спрыяла іх мабільнасці. Магчымасць наведаць аддаленыя ад месца пражывання куткі сваёй краіны фарміравала ўяўленне пра свой народ як калектыўнае цэлае, ніверавала вобраз "чужынца", які грунтаваўся на спрадвечным механізме традыцыйнай ідэнтыфікацыі "мы – яны".

У працэсах нацыянальнага будаўніцтва адукацыя, як важны праваднік нацыянальнай культуры, а таксама веды заўсёды займалі значнае месца. Такім чынам, у катэгорыі асветніцка-адукацыйных дэтэрмінантаў неабходна вылучыць *дзяржаўную палітыку ў галіне адукацыі і асветы,* а таксама *дзейнасць інтэлігенцыі.*

У дарэформную эпоху пры некаторых цэрквах і касцёлах засноўваліся прыходскія (парафіяльныя школы, дзе маглі вучыцца і сялянскія дзеці); таксама школы для сваіх сялян засноўвалі і некаторыя землеўладальнікі [13, с . 166].

Як адзначае, С.М. Токць, пасля скасавання прыгоннай залежнасці пытанне адукацыі сялянскага стала вельмі актуальным. Імператарскі загад ад 18 студзеня 1862 г. прадпісваў мясцовым уладам ствараць у "Заходніх" губернях сельскія вучылішчы Міністэрства народнай асветы. На пачатковую школу ўскладвалася ў першую чаргу ідэалагічная місія [13, с. 168]. Аднак аўтар звяртае ўвагу, што паводле назіранняў школьных інспектараў, толькі каля 20% вучняў больш-менш нармальна праходзілі поўны курс школьнай навукі народнага вучылішча" [13, с. 184].

Пашырэнне адукацыі, увядзенне праграм атрымання ведаў на роднай мове істотна ўплывае на нацыянальную свядомасць насельніцтва, засваенню ёй пэўных этычных норм і каштоўнасцей. Параўноўваючы сітуацыю з пашырэннем адукацыі на беларускіх землях з іншымі еўрапейскімі рэгіёнамі, можна адзначыць што ў Чэхіі ўжо ў 1791 г. было 2600 школак, у якіх навучалася 185 тысяч дзяцей, прычым выкладанне вялося па-чэшску [3, с. 104].

Такім чынам, варта зазначыць што развіццё адукацыі не толькі ўплывае на ход нацыябудаўнічых працэсаў, але фарміруе ў асобы пэўны тып мыслення, рацыянальнае ўспрыманне свету, дае магчымасць

засвойваць пісьмовыя тэксты культуры, пашыраючы ўласны вопыт і змяняючы асэнсаванне свайго месца ў гэтым свеце. Невысокі ўзровень пашыранасці адукацыі сярод беларусаў на працягу XIX ст., з аднаго боку, рабіў іх шмат у чым неўспрымальнымі да нацыянальнай агітацыі, а з другога – спрыяў захаванню асаблівага містычнага ўспрымання свету, у якім незвычайнае знаходзілася побач, у рэальным свеце, і ва ўсім адчувалася ўздзеянне звышсіл. Культурны вопыт назапашваўся і перадаваўся праз вусную традыцыю.

Многія даследчыкі, разглядаючы працэс станаўлення сучасных нацый, адводзяць істотную ролю ў дадзеным працэсе інтэлігенцыі. Менавіта на гэтую сацыяльную групу ўскладваецца найважнейшая задача па стварэнню нацыянальных тэкстаў у кантэксце высокай культуры, фарміраванне нацыянальнага праекту.

Нягледзячы на слабую артыкуляванасць беларускай нацыянальнай ідэі на працягу большай часткі XIX ст., многія прадстаўнікі мясцовай шляхты, выхаваныя ў традыцыях польскай культуры, пад уплывам ідэй рамантызму і лібералізму пачыналі звяртацца да культуры простага народу. Ствараючы на яе грунце ўзоры высокага мастацтва, у першую чаргу ў літаратуры, яны ўздымалі традыцыйную беларускую культуру на новы ўзровень, спрыялі трансляцыі нормаў, каштоўнасцяў, асаблівасцей светапогляду беларускага народа. Гэтым адзначалася дзейнасць таварыстваў філаматаў і філарэтаў Віленскага ўніверсітэта.

Шэраг выдатных вучоных зрабіў свой унёсак у вывучэнне традыцыйнай культуры беларускага народа, яго традыцый фальклору, асаблівасцей побыту і мовы – З. Даленга-Хадакоўскі, М. Бароўскі, А. Рыпінскі, П. Шпілеўскі, І. Насовіч і інш. Менавіта гэтыя асобы стаялі ля вытокаў навуковага беларусазнаўства, чые дасягненні ў далейшым значна паўплывалі на развіццё беларускай мовы, літаратуры, гістарычнай навукі.

Характаразуючы ролю інтэлігенцыі ў фарміраванні нацыянальнай свядомасці беларусаў, П.В. Церашковіч адзначае, што на мяжы 1850–1860-х гг. насельніцтва Беларусі захавала ў агульных рысах папярэднюю этнасацыяльную структуру. Этнічная самасвядомасць пачала фарміравацца толькі ў асяроддзі вузкага кола інтэлегенцыі, выхадцаў з асяроддзя шляхты і духавенства, а таксама ў асобных прадстаўнікоў пануючага класа [14, с. 97]. Даследчык канстатуе невысокую ступень уплыву беларуска артыкуляваных літаратуры, фалькларыстыкі, гісторыяграфікі на этнічную свядомасць на масавым узроўні [14, с. 75].

У 1859 г. засноўвае сваю друкарню ў Вільні А. Кіркор. Вакол вучонага ўтварыўся гурток мясцовых літаратараў і публіцыстаў, да якога мелі дачыненне У. Сыракомля, В. Каратынскі, В. Дунін-Марцінкевіч, А. Вярыга-Дарэўскі і інш. [5, с. 84–85].

Другая палова XIX стагоддзя характарызуецца станаўленнем беларускай нацыянальнай літаратуры. Тэмы нацыянальнай годнасці, лёсу і прызначэння беларусаў загучалі ў творах Ф. Багушэвіча, А. Гурыновіча, Я. Лучыны і інш.

Такім чынам, прадстаўнікі інтэлігенцыі, акрамя захавання і трансляцыі беларускай культуры, стварэння на яе грунце ўзораў высокага мастацтва, сваёй дзейнасцю сцвярджалі каштоўнасці чалавечай годнасці, свабоды асобы, адказнасці, ведаў.

Духоўныя сацыякультурныя дэтэрмінанты займаюць у фарміраванні нацыянальнага этасу асаблівае месца. Яны выступаюць фактарамі ацэнкі навацый і знешніх уплываў у адпаведнасці з іх традыцыйным ладам жыцця, асаблівасцямі народнага характару. Такім чынам, адной з утваральных дэтэрмінантаў нацыянальнага этасу трэба лічыць *традыцыйную культуру*.

Пад уздзеяннем рэлігійных і сацыяльных фактараў, якія спрыялі кансервацыі традыцыйнага укладу жыцця, у асяроддзі асноўнай часткі насельніцтва на беларускіх землях (сялян) у XIX ст. не толькі захавалася, але і працягвала функцыянаваць і уплываць на жыццядзейнасць народная культура. Беларуская народная культура рэфлексавалася ў творчасці многіх дзеячаў культуры і мастацтва: А. Міцкевіча, Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, У. Сыракомлі, В. Дуніна-Марцінкевіча і інш.

Беларускі даследчык П.Р. Ігнатовіч сцвярджае, што традыцыйная народная культура вызначае і нарміруе ўсе аспекты жыццядзейнасці супольнасці: уклад жыцця, формы гаспадарчай дзейнасці, рэгуляванне сацыяльных узаемаадносін членаў супольнасці, тып сям'і, выхаванне дзяцей, характар жылля, тып адзення, харчавання, засваенне акаляючай прасторы, адносіны з прыродай, светам, паданні, вераванні, звычкі, абрады, павер'і, веды, мову, фальклор [15, с. 34].

Такім чынам, традыцыйная культура рэгулявала амаль увесь спектр паводзін ва ўсіх сферах жыццядзейнасці беларусаў. Такія этычныя характарыстыкі, як сціпласць, самадастаковасць, сумленне, разлік як на ўласныя сілы, так і на волю Бога, крытычнае стаўленне да новаўвядзенняў сталі важнымі рысамі нацыянальнага этасу беларусаў. Каштоўнасныя арыентацыі, маральна-этычныя нормы традыцыйнай культуры, непасрэдна ўплывалі на характар іншых дэтэрмінантаў нацыянальнага этасу.

Як замежныя, так і айчынныя даследчыкі адводзяць важнае месца ў нацыятворчых працэсах *рэлігіі*. Акрамя задавальнення спецыфічных духоўных патрэб насельніцтва, прапаганды хрысціянскіх

каштоўнасцяў, тлумачэння месца чалавека ў структуры светабудовы, доўгі час для беларусаў яна адыгрывала істотную ролю ў этнакультурнай самаідэнтыфікацыі. Пасля ўключэння беларускіх земляў у склад Расійскай імперыі гэтым актыўна карысталіся як дзеючая ўлада, так і мясцовыя эліты, праводзячы этнічны падзел у залежнасці ад канфесійнай прыналежнасці (праваслаўны – рускі, каталік – паляк).

Шэраг спецыялістаў адводзяць дзейнасці ўніяцкай царквы на нашых землях, амаль да сярэдзіны XIX стагоддзя, істотнае месца ў фарміраванні ў беларусаў уяўлення пра сябе як асобнага этнакультурнага суб’екта. Ролю ўніяцкай царквы і ўніяцкай інтэлігенцыі адзначае А.А. Суша: “уніяцкая духоўная інтэлігенцыя ў значнай ступені фармавала самасвядомасць беларусаў, выхоўваючы іх у духу любові да Айчыны, адданасці свайму краю (а не Польшчы ці Расіі), талерантнасці (праз здольнасць прымірыць у сваёй веры два адгалінаванні хрысціянства), павагі да працы і навукі, выкрышталёўваючы этнічную свядомасць” [16, с. 14–15].

Прыналежнасць да рэлігійных канфесій можа быць істотным чыннікам уласнай самаідэнтыфікацыі, прыналежнасці да пэўнага сацыяльнага цэлага, што адбіваецца на ходзе нацыятворчых працэсаў. Як адзначае Р. Радзік, тоеснасць, якая грунтавалася на глебе праваслаў’я, на ўсходнеславянскіх землях (беларускіх і ўкраінскіх) доўга дамінавала над такой формай калектыўнага самаўсведамлення, як нацыя. У той час літоўцы ў перыяд станаўлення нацыянальнага руху мелі сваю як моўную, так і рэлігійную, а таксама цывілізацыйную адметнасць, што дазваляла ім супрацьстаяць русіфікацыі [3, с. 115].

Яшчэ у другой палове XIX ст. уключэнне беларусамі (асабліва праваслаўнымі) ў свае рэлігійныя практыкі звычаі і абрады дахрысціянскага, паганскага паходжання працягвала заставацца спецыфічнай рысай духоўнага жыцця на нашых землях. Пры гэтым усё больш пашыраўся скептычны, іранічны погляд на дзейнасць святароў і рэлігійныя абрады [17, с. 116–117].

Тым не менш, нягледзячы на характар дзейнасці інстытута царквы ці стаўлення да яе, асаблівасці хрысціянскага светапогляду праціналі ўспрыманне беларусамі навакольнай рэчаіснасці. Гэта тычылася як уласных паводзін, так і адносін да бліжняга. Нацыянальны этас беларусаў увабраў у сябе шэраг хрысціянскіх дабрачыннасцяў: любоў, абавязак, міласэрнасць, свабода волі і інш.

**Заключэнне.** Сацыякультурныя дэтэрмінанты нацыянальнага этасу адыгрываюць вызначальную ролю ў фарміраванні маральна-этычных арыентацый, норм паводзін у ходзе нацыятворчых працэсаў. У залежнасці ад характару ўплыву той ці іншай дэтэрмінанты можна растлумачыць развіццё і скіраванасць этасу той ці іншай супольнасці. Асаблівасць фарміравання нацыянальнага этасу беларусаў вызначаецца абмежаванасцю ўплыву грамадска-палітычных дэтэрмінантаў (адсутнасць на працягу доўгага перыяду ўласнай дзяржаўнасці, нацыянальнай адукацыі, адносна позняе з’яўленне і невялікі маштаб дзей-насці нацыянальна арыентаваных грамадскіх і палітычных рухаў, геапалітычнае становішча), што пры-водзіла да замаруджвання фарміравання нацыянальнай ідэі і распаўсюджвання нацыянальнай агітацыі, у тым ліку з-за адсутнасцю нацыянальнай адукацыі і слабой развітасці асветніцкай дзейнасці. Аднак пры адсутнасці вялікіх беларускіх супольнасцяў у буйных, а таксама эфектыўных камунікацыйных каналаў асаблівасці беларускай культуры трансляваліся галоўным чынам праз традыцыю. Менавіта духоўныя сацыякультурныя дэтэрмінанты (традыцыйная культура і рэлігія) ляглі ў аснову беларускага этасу на ключавых стадыях яго фарміравання.

ЛІТАРАТУРА

1. Ерышов, Д.В. Социокультурные детерминанты нормативного сознания и деятельности социального субъекта : автореф. дис. … канд. философ. наук : 09.00.11 / Д.В. Ерышов ; Армав. гос. пед. ун-т. – Армавир, 2015. – 24 с.
2. Кужугет, А.К. Социокультурные детерминанты исторической динамики духовной культуры тувинцев : автореф. дис. на … д-ра культурологии : 24.00.01 / А.А. Кужугет ; Тувинский ин-т гуманитар. исслед. – Кемерово, 2006. – 44 с.
3. Радзік, Р. Беларусы на фоне нацыятворчых працэсаў у грамадствах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы / Р. Радзік ; пер. С. Петрыкевіча // Беларус. гістар. агляд. – 2011. – Т. 18, сш. 1/2. – С. 99–122.
4. Сакалова, М.А Палітычная сітуацыя на беларускіх землях у 1815–1830 г. у кантэксце “новай палітычнай гісторыі” / М. Сакалова // Беларус. гістар. агляд. – 2012. – Т. 19, сш. 1/2. – С. 109–138.
5. Баршчэўскі, Л.П. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён : папулярныя нарысы / Л.П. Баршчэўскі, П.В. Васючэнка, М.А. Тычына. – Мінск : Радыёла-плюс, 2006. – 574 с.
6. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2005. – Т. 4 : Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII–пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. – 2005. – 518 с.
7. Беларусы / В. К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 4 : Вытокі і этнічнае развіццё. – 432 с.
8. Макарэвіч, В.С. Трансфармацыя сацыяльнай структуры дваранства Беларусі ў канцы XVIII—XIX ст. / В.С. Макарэвіч // Навук. зб. / Гістарыч. фак. БДУ. – Мінск, 2009. – Вып . 4 : Працы гістарычнага факультэта БДУ. – С. 33–40.
9. Каханоўскі, А.Г. Шляхі сацыяльнай мабільнасці насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. / А.Г. Каханоўскі // Навук. зб. / Гістарыч. фак. БДУ. – Мінск, 2010. – Вып. 5 : Працы гістарычнага факультэта БДУ. – С. 48–56.

10. Люты, А.М. Сацыяльнае і эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX стагоддзя : манагр. / А.М. Люты. – Мінск : БДПУ, 2004. – 320 с.
11. Запруднік, Я. Беларусь на гістарычных скрыжаваннях / Я. Запруднік. – Мінск : Бел. фонд Сораса, 1996. – 264 с.
12. Карпіевіч, В.А. Развіцце гандлю ў Беларусі (1861–1900) : аўарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 : 30.05.2003 / В.А. Карпіевіч ; Беларус. дзярж. пед. ун-т ім. М. Танка. – Мінск., 2003. – 20 с.
13. Токць, С.М. Сацыяльныя і культурныя працэсы ў беларускай вёсцы ў другой палове XIX – пачатку XX ст. / С.М. Токць. – Мінск : Дзярж. ін-т кіравання і сацыял. тэхналогій БДУ, 2016. – 327 с.
14. Терешкович, П.В. Этническая история Беларуси XIX – начала XX в.: в контексте Центр.-Вост. Европы / П.В. Терешкович. – Мінск : БГУ, 2004. – 221 с.
15. Ігнатовіч, П.Р. Традыцыйная культура ў сучасным сацыякультурным працэсе Беларусі / П.Р. Ігнатовіч // Культура. Наука. Творчество Культура. Навука. Творчасць. Culture. Science. Arts : сб. науч. ст. / Белорус. гос. акад. музыки. – Минск, 2008. – С. 33–36.
16. Суша, А.А. Уплыў уніі на этнічную самасвядомасць беларусаў / А.А. Суша // Человек. Культура. Общество / Бел. гос. ун-т. – Минск, 2005. – С. 12–15.
17. Токць, С.М. Змены ў рэлігійным жыцці беларускай вёскі ў другой палове XIX – напачатку XX ст. / С.М. Токць // Гадавік Цэнтра Беларус. Студыяў. – 2015. – Г. 1, № 1. – С. 97–119.

*Паступіў 05.09.2017*

## SOCIO-CULTURAL DETERMINANTS OF FORMATION OF NATIONAL ETHOS

***K. LYSAK***

*Formation of a nation is a complicated process that takes place under an influence of a system of internal and external socio-cultural conditions. Together with a creation of high national culture samples, an emergence of nationalist movements, an expansion of a national consciousness, is established a system of moral and ethical norms, values, behaviors that are typical for representatives of certain national community, – a national ethos.*

*Nation building processes in the Belarusian lands in the XIX century occurred in the context of an emergence of modern nations in the Eastern European region. Specificity of formation of the Belarusian nation was associated with both political conditions and with features of the Belarusian culture. Identification and characterization of socio-cultural determinants of the national ethos in early stages of formation of the Belarusian nation is directed to a disclosure of a value system and basic moral norms inherent to the Belarusians.*

***Keywords**: national ethos, social and cultural determinants, nation building processes.*